№ 89 (211)

Серада, 28 мая 1997 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г. на беларускай і рускай мовах
Перыядычнасць — 5 разоў у тыдзень
Выдавец — ТАА "Народная воля"
Кошт: у кіёсках і крамах — 2000 руб., у індывідуальных гандляроў — свабодны.

Народная Воля

На прастор, на шырокі разлог
Выхадзі, мой народ, грамадою...

Якуб Колас

Сонца

	Усход	Заход
Віцебск	4.32	21.22
Магілёў	4.38	21.14
Гомель	4.43	21.03
Мінск	4.49	21.24
Гродна	5.05	21.38
Брэст	5.14	21.31

Апошняя квадра 29 мая

СТАТУТ САЮЗА БЕЛАРУСІ І РАСІІ

Рэспубліка Беларусь і Расійская Федэрацыя, кіруючыся воляй народаў да супольнасці дзвюх дзяржаў, стварылі Саюз Беларусі і Расіі (далей называецца — Саюз).

Глава I
Прынцыпы і мэты Саюза

Артыкул 1

Рэспубліка Беларусь і Расійская Федэрацыя /далей называюцца — дзяржавы-удзельніцы Саюза/, што стварылі Саюз, дзейнічаюць на аснове гэтага Статута, які з'яўляецца неад'емнай часткай Дагавора аб Саюзе Беларусі і Расіі ад 2 красавіка 1997 года.

Артыкул 2

Устанаўліваецца грамадзянства Саюза. Кожны грамадзянін Рэспублікі Беларусь і кожны грамадзянін Расійскай Федэрацыі з'яўляецца адначасова грамадзянінам Саюза.

Артыкул 3

Саюз засноўваецца на прынцыпах суверэннай роўнасці дзяржаў-удзельніц Саюза, дэмакратыі і павагі да правоў чалавека і грамадзяніна, супрацоўніцтва і ўзаемадапамогі, добраахвотнасці, добрасумленнага выканання ўзаемных абавязацельстваў і на іншых агульнапрызнаных прынцыпах і нормах міжнароднага права.

Перспектывы развіцця Саюза накіраваны на паслядоўны рух да добраахвольнага аб'яднання дзяржаў-удзельніц Саюза на аснове свабоднага волевыяўлення іх народаў, зыходзячы з канстытуцый дзяржаў-удзельніц Саюза і агульнапрызнаных прынцыпаў і норм міжнароднага права.

Артыкул 4

У межах паўнамоцтваў, нададзеных гэтым Статутам, Саюз валодае міжнароднай правасуб'ектнасцю.

Артыкул 5

Прававой асновай дзейнасці Саюза з'яўляюцца Дагавор аб Саюзе Беларусі і Расіі ад 2 красавіка 1997 года, гэты Статут, іншыя дагаворы паміж дзяржавамі-удзельніцамі Саюза, нарматыўныя прававыя акты органаў Саюза, прынятыя ў межах іх кампетэнцыі.

Пры гэтым Дагавор аб стварэнні Супольніцтва Беларусі і Расіі ад 2 красавіка 1996 года, нарматыўныя прававыя акты, прынятыя раней органамі Супольніцтва Беларусі і Расіі, працягваюць дзейнічаць у частцы, што не супярэчыць Дагавору аб Саюзе Беларусі і Расіі ад 2 красавіка 1997 года, неад'емнай часткай якога з'яўляецца гэты Статут.

Артыкул 6

Мэтамі Саюза з'яўляюцца:

а) умацаванне адносін братэрства, дружбы і ўсебаковага супрацоўніцтва паміж дзяржавамі-удзельніцамі Саюза ў палітычнай, эканамічнай, сацыяльнай, ваеннай, навуковай, культурнай і іншых галінах;

б) павышэнне ўзроўню жыцця народаў і стварэнне спрыяльных умоў для ўсебаковага гарманічнага развіцця асобы;

в) устойлівае сацыяльна-эканамічнае развіццё дзяржаў-удзельніц Саюза на аснове аб'яднання іх матэрыяльнага і інтэлектуальнага патэнцыялаў, выкарыстання рынкавых механізмаў функцыянавання эканомікі;

г) збліжэнне нацыянальных прававых сістэм, фарміраванне прававой сістэмы Саюза;

д) забеспячэнне бяспекі і падтрыманне высокай абараназдольнасці, сумесная барацьба са злачыннасцю;

е) садзейнічанне забеспячэнню агульнаеўрапейскай бяспекі і развіццю ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва ў Еўропе і свеце.

Артыкул 7

Удзельніцай Саюза можа стаць дзяржава — член Арганізацыі Аб'яднаных Нацый, якая падзяляе мэты і прынцыпы Саюза і прымае на сябе абавязацельствы, прадугледжаныя Дагаворам аб Саюзе Беларусі і Расіі ад 2 красавіка 1997 года і гэтым Статутам. Далучэнне да Саюза ажыццяўляецца са згоды дзяржаў-удзельніц Саюза.

Пры далучэнні да Саюза новай дзяржавы разглядаецца пытанне аб змяненні назвы Саюза.

Глава II
Задачы Саюза

Артыкул 8

У палітычнай сферы задачамі Саюза з'яўляюцца:

а) узгадненне пазіцый і дзеянняў пры вырашэнні агульных палітычных праблем;

б) выпрацоўка агульных пазіцый па міжнародных пытаннях, якія ўяўляюць узаемны інтарэс;

в) ажыццяўленне ўзгодненых мер па забеспячэнню міжнароднага міру і бяспекі, у тым ліку шляхам дасягнення міжнародных дамоўленасцей аб абмежаванні і скарачэнні ўзбраенняў і ваенных выдаткаў, аб ліквідацыі ядзернай і іншых відаў зброі масавага знішчэння;

г) садзейнічанне развіццю дэмакратыі ў Саюзе, захаванню і абароне правоў і асноўных свабод чалавека і грамадзяніна ў адпаведнасці з агульнапрызнанымі прынцыпамі і нормамі міжнароднага права.

Артыкул 9

У эканамічнай сферы задачамі Саюза з'яўляюцца:

а) забеспячэнне дынамічнага эканамічнага развіцця дзяржаў-удзельніц Саюза;

б) стварэнне роўных умоў і гарантый дзейнасці суб'ектаў гаспадарання, адзінай эканамічнай прасторы дзяржаў-удзельніц Саюза;

в) фарміраванне і рэалізацыя ўзгодненай праграмы рынкавых рэформ з улікам асаблівасцей эканамічнага развіцця кожнай дзяржавы-удзельніцы Саюза;

г) стварэнне ўмоў для свабоднай эканамічнай канкурэнцыі суб'ектаў гаспадарання;

д) стварэнне і развіццё агульнай інфраструктуры, і ў першую чаргу аб'яднаных транспартнай і энергетычнай сістэм, сістэмы сувязі, адзінай навукова-тэхналагічнай і інфармацыйнай прасторы;

е) уніфікацыя грашова-крэдытных, бюджэтных і падатковых сістэм, а таксама стварэнне неабходных умоў для ўвядзення адзінай валюты;

ж) прымяненне ў адносінах з трэцімі краінамі аднолькавага рэжыму гандлю, агульных мытных тарыфаў, мер нетарыфнага рэгулявання знешняга гандлю;

з) развіццё ўзаемнага гандлю і эфектыўнае функцыянаванне адзінай мытнай прасторы;

і) стварэнне ўмоў для дзейнасці сумесных транснацыянальных кампаній;

к) узгадненне структурнай палітыкі з мэтай эфектыўнага выкарыстання эканамічнага патэнцыялу дзяржаў-удзельніц Саюза;

л) забеспячэнне на тэрыторыі адной з дзяржаў-удзельніц Саюза грамадзянам і юрыдычным асобам іншай дзяржавы-удзельніцы Саюза нацыянальнага рэжыму ў галіне набыцця маёмасці, валодання, карыстання і распараджэння ёю.

Артыкул 10

У сацыяльнай сферы задачамі Саюза з'яўляюцца:

а) распрацоўка адзіных падыходаў пры вылічэнні памераў аплаты працы, пенсіённага забеспячэння, у тым ліку памераў дапамог ветэранам вайны, узброеных сіл і працы, інвалідам і малазабяспечаным сем'ям, а таксама пры вызначэнні льгот і іншых мер сацыяльнай абароны;

б) забеспячэнне роўных правоў грамадзян дзяржаў-удзельніц Саюза пры атрыманні адукацыі, медыцынскай дапамогі, у працаўладкаванні, аплаце працы, прадастаўленні іншых сацыяльных гарантый;

в) устанаўленне адзіных норм у галіне аховы працы, сацыяльнага страхавання, вытворчай і сацыяльнай гігіены;

г) стварэнне агульнай інфармацыйнай базы даных па пытаннях занятасці насельніцтва і наяўнасці працоўных вакансій;

д) садзейнічанне развіццю адукацыі, узаемаўзбагачэнню культур, ажыццяўленню роўных умоў захавання і развіцця этнічнай, культурнай і моўнай самабытнасці народаў.

Артыкул 11

У сферы забеспячэння бяспекі задачамі Саюза з'яўляюцца:

а) прыняцце ў выпадку неабходнасці сумесных мер па прадухіленню пагрозы суверэнітэту і незалежнасці кожнай з дзяржаў-удзельніц Саюза;

б) каардынацыя дзейнасці дзяржаў-удзельніц Саюза ў галіне ваеннага будаўніцтва і развіцця іх узброеных сіл, сумеснае выкарыстанне ваеннай інфраструктуры і прыняцце іншых мер з улікам інтарэсаў дзяржаў-удзельніц Саюза для падтрымання як іх абараназдольнасці, так і абараназдольнасці Саюза ў цэлым;

в) распрацоўка і размяшчэнне сумеснага абароннага заказу, забеспячэнне на яго аснове паставак і рэалізацыі ўзбраенняў і ваеннай тэхнікі, стварэнне аб'яднанай сістэмы тэхнічнага забеспячэння ўзброеных сіл дзяржаў-удзельніц Саюза;

г) ажыццяўленне ўзгодненай пагранічнай палітыкі, распрацоўка і рэалізацыя сумесных праграм па пагранічных пытаннях, арганізацыя ўзаемадзеяння органаў кіравання пагранічнымі войскамі дзяржаў-удзельніц Саюза па ахове граніц Саюза;

д) барацьба з карупцыяй, тэрарызмам і іншымі відамі злачыннасці.

Артыкул 12

У прававой сферы задачамі Саюза з'яўляюцца:

а) развіццё нарматыўнай прававой базы ў мэтах забеспячэння далейшай інтэграцыі дзяржаў-удзельніц Саюза;

б) уніфікацыя і ўзгодненае развіццё заканадаўства дзяржаў-удзельніц Саюза;

в) супрацоўніцтва ў галіне кадыфікацыі і сістэматызацыі нарматыўных прававых актаў;

г) узаемная юрыдычная дапамога, супрацоўніцтва ў стварэнні і развіцці інфармацыйных баз даных у розных галінах права.

Артыкул 13

Паўнамоцтвы Саюза і яго органаў накіраваны на забеспячэнне роўнасці палітычных і сацыяльна-эканамічных правоў грамадзян.

Асноўнымі абавязкамі дзяржаў-удзельніц Саюза з'яўляюцца:

забеспячэнне свабоды слова і сродкаў масавай інфармацыі;

забеспячэнне прававых гарантый дзейнасці афіцыйна зарэгістраваных партый і грамадскіх аб'яднанняў, у тым ліку апазіцыйных;

забеспячэнне гарантый недатыкальнасці прыватнай уласнасці;

прававое забеспячэнне інвестыцыйнай палітыкі і эфектыўная абарона правоў інвестараў у межах граніц Саюза;

гарантаванне свабоднай эканамічнай канкурэнцыі суб'ектаў гаспадарання;

захаванне іншых правоў і свабод чалавека і грамадзяніна, замацаваных у міжнародна-прававых дакументах і ў нацыянальным заканадаўстве.

Артыкул 14

Органы Саюза і дзяржавы-удзельніцы Саюза забяспечваюць выкананне задач Саюза, прадугледжаных артыкуламі 8—12 гэтага Статута.

Задачы Саюза рэалізуюцца органамі Саюза ў межах паўнамоцтваў і ў парадку, прадугледжаным гэтым Статутам, а органамі дзяржаў-удзельніц Саюза — у парадку, прадугледжаным для выканання міжнародна-прававых абавязацельстваў і нацыянальным заканадаўствам.

Глава III
Паўнамоцтвы Саюза

Артыкул 15

Дзяржавы-удзельніцы Саюза надзяляюць Саюз наступнымі паўнамоцтвамі:

а) забеспячэнне правоў грамадзян дзяржаў-удзельніц Саюза, якімі яны надзяляюцца як грамадзяне Саюза;

б) забеспячэнне роўнасці правоў грамадзян Саюза пры атрыманні ўсіх відаў адукацыі і медыцынскай дапамогі, у працаўладкаванні, аплаце працы і іншых галінах;

в) прыняцце прававых актаў Саюза; стварэнне прававой сістэмы Саюза; узгадненне дзеянняў у працэсе развіцця заканадаўства дзяржаў-удзельніц Саюза;

г) стварэнне і рэгуляванне дзейнасці агульнага рынку ў галіне энергетыкі, транспарту і сувязі;

д) забеспячэнне свабоднага перамяшчэння тавараў, паслуг, капіталаў, рабочай сілы ў межах граніц Саюза;

е) правядзенне адзінай мытнай палітыкі, уключаючы забеспячэнне адзінства кіравання мытнай справай;

ж) забеспячэнне сацыяльных умоў для функцыянавання адзінай навуковай, тэхналагічнай і інфармацыйнай прасторы, правядзенне ўзгодненай структурнай палітыкі, рэалізацыя сумесных навуковых і тэхналагічных праграм;

з) забеспячэнне адзінага падыходу ў прававым рэгуляванні інтэлектуальнай уласнасці;

і) каардынацыя дзейнасці ў сферы валютнага рэгулявання;

к) увядзенне адзіных стандартаў, правілаў бухгалтарскага ўліку, вядзенне адзінай статыстыкі;

л) распрацоўка, зацвярджэнне і выкананне бюджэту Саюза;

м) выкарыстанне маёмасці Саюза;

н) кантроль за выкананнем прынятых рашэнняў, уключаючы выкананне бюджэту Саюза;

о) увядзенне сімволікі Саюза.

Дзяржавы-удзельніцы могуць перадаваць Саюзу таксама іншыя паўнамоцтвы ў парадку, прадугледжаным артыкулам 36 гэтага Статута.

Артыкул 16

У мэтах рэалізацыі задач Саюза дзяржавы-удзельніцы Саюза прымаюць узгодненыя рашэнні па наступных пытаннях:

а) распрацоўка і ажыццяўленне сумесных праграм у эканамічнай, сацыяльнай, экалагічнай і культурнай галінах;

б) арганізацыя ўзаемадзеяння дзяржаў-удзельніц Саюза ў галіне знешняй палітыкі па пытаннях, якія ўяўляюць узаемны інтарэс;

в) каардынацыя знешнеэканамічнай палітыкі, у тым ліку ў дачыненні да тавараў і паслуг, якія перамяшчаюцца цераз мытную мяжу Саюза, уключаючы ліцэнзаванне, рэгуляванне цэн і іншыя меры нетарыфнага рэгулявання, устанаўленне ставак увазных і вывазных пошлін і памераў іншых мытных плацяжоў /уключаючы акцызы/, іншых падаткаў, звязаных са знешнеэканамічнай дзейнасцю, а таксама ўзгодненага механізму іх прымянення;

г) забеспячэнне калектыўнай бяспекі дзяржаў-удзельніц Саюза;

д) узаемадзеянне ў забеспячэнні тэрытарыяльнай недатыкальнасці дзяржаў-удзельніц Саюза і аховы межаў Саюза;

е) забеспячэнне барацьбы з арганізаванай злачыннасцю, карупцыяй, тэрарызмам і іншымі відамі злачынстваў;

ж) фарміраванне ўзгодненых прававых асноў эканамічнага, сацыяльна-культурнага развіцця дзяржаў-удзельніц Саюза, уніфікацыя прававога рэжыму ўтварэння і дзейнасці юрыдычных асоб;

з) распрацоўка адзіных падыходаў пры вызначэнні мер сацыяльнай абароны, у тым ліку ў галіне занятасці, аховы працы, вытворчай і сацыяльнай гігіены, сацыяльнага страхавання, пенсіённага забеспячэння;

і) уніфікацыя грашова-крэдытных, бюджэтных і валютных сістэм, фінансавых рынкаў, узгадненне асноў антыманапольнага, падатковага і інвестыцыйнага заканадаўства;

к) каардынацыя дзейнасці ў галіне аховы навакольнага асяроддзя, гідраметэаралогіі, забеспячэнне экалагічнай бяспекі, ліквідацыя наступстваў стыхійных бедстваў і аварый, перш за ўсе аварыі на Чарнобыльскай АЭС.

Па пералічаных у гэтым артыкуле пытаннях органы Саюза прымаюць рашэнні ў адпаведнасці з іх кампетэнцыяй або дзяржавы-удзельніцы Саюза, у выпадку неабходнасці, заключаюць міжнародныя дагаворы.

Артыкул 17

Гэты Статут не закранае правоў і абавязацельстваў дзяржаў-удзельніц Саюза па іншых міжнародных дагаворах, у тым ліку прынятых у рамках Садружнасці Незалежных Дзяржаў.

Глава IV
Грамадзянства Саюза

Артыкул 18

Наяўнасць у грамадзяніна Рэспублікі Беларусь і грамадзяніна Расійскай Федэрацыі грамадзянства Саюза не прымяншае яго правоў і свабод і не вызваляе ад абавязкаў, якія вынікаюць з грамадзянства адпаведнай дзяржавы-удзельніцы Саюза.

Разам з правамі і абавязкамі, якія вынікаюць з грамадзянства адпаведнай дзяржавы-удзельніцы Саюза, грамадзяне Саюза надзяляюцца правамі і выконваюць абавязкі, звязаныя з грамадзянствам Саюза.

Грамадзянін Саюза мае права:

а) на свабоднае перамяшчэнне і пастаяннае пражыванне ў межах тэрыторыі Рэспублікі Беларусь і тэрыторыі Расійскай Федэрацыі з выкананнем правілаў, якія ўстаноўлены законамі гэтых дзяржаў у дачыненні да асобных раёнаў і мясцовасцей;

б) на абарону на тэрыторыі трэцяй краіны, дзе няма прадстаўніцтва дзяржавы-удзельніцы Саюза, грамадзянінам якой ён з'яўляецца, з боку дыпламатычных прадстаўніцтваў ці консульскіх устаноў іншай дзяржавы-удзельніцы Саюза на тых жа ўмовах, што і грамадзяне гэтай дзяржавы;

в) на ўдзел у кіраванні справамі Саюза;

г) на валоданне, карыстанне і распараджэнне маёмасцю на тэрыторыі іншай дзяржавы-удзельніцы Саюза на тых жа ўмовах, што і грамадзяне гэтай дзяржавы.

Грамадзянін Саюза, які пастаянна пражывае ў іншай дзяржаве-удзельніцы Саюза, мае права выбіраць і быць выбраным у органы мясцовага самакіравання на тэрыторыі гэтай дзяржавы.

Глава V
Органы Саюза

Артыкул 19

Для рэалізацыі задач Саюза дзяржавы-удзельніцы Саюза ўтвараюць на парытэтных асновах Вышэйшы Савет Саюза, Парламенцкі Сход Саюза, Выканаўчы Камітэт Саюза і, у выпадку неабходнасці, іншыя органы Саюза.

Рашэнні органаў Саюза прымаюцца ў межах іх кампетэнцыі і без урону канстытуцыям дзяржаў-удзельніц Саюза. Пры гэтым рашэнні Вышэйшага Савета Саюза і Выканаўчага Камітэта Саюза падлягаюць непасрэднаму выкананню органамі Саюза і, з захаваннем патрабаванняў заканадаўстваў дзяржаў-удзельніц Саюза, іх органамі выканаўчай улады.

Пры неабходнасці органы дзяржаўнай улады дзяржаў-удзельніц Саюза прыводзяць свае прававыя акты ў адпаведнасць з рашэннямі органаў Саюза або выдаюць прававыя акты, якія забяспечваюць рэалізацыю гэтых рашэнняў.

Глава VI
Вышэйшы Савет Саюза

Артыкул 20

Вышэйшым органам Саюза з'яўляецца Вышэйшы Савет Саюза, у які ўваходзяць кіраўнікі дзяржаў, кіраўнікі ўрадаў, кіраўнікі палат парламентаў дзяржаў-удзельніц Саюза, а таксама старшыня Выканаўчага Камітэта Саюза з правам дарадчага голаса.

Вышэйшы Савет Саюза:

а) вырашае важнейшыя пытанні развіцця Саюза;

б) разглядае пытанні, што закранаюць правы і свабоды грамадзян Саюза;

в) утварае ў межах сваёй кампетэнцыі органы Саюза, забяспечвае іх узаемадзеянне, вызначае іх месцазнаходжанне і ўмовы іх знаходжання;

г) зацвярджае бюджэт Саюза, разгледжаны Парламенцкім Сходам Саюза;

д) прымае нарматыўныя прававыя акты Саюза і зацвярджае міжнародныя дагаворы Саюза, разгледжаныя Парламенцкім Сходам Саюза;

е) забяспечвае ўзаемадзеянне органаў Саюза з органамі дзяржаўнай улады дзяржаў-удзельніц Саюза;

ж) прымае рашэнні па пытаннях забеспячэння бяспекі дзяржаў-удзельніц Саюза, іх калектыўнай абароны ад знешніх замахаў, аховы граніц Саюза, ваеннага будаўніцтва, барацьбы са злачыннасцю;

з) не радзей чым адзін раз у год заслухоўвае справаздачу Выканаўчага Камітэта Саюза аб рэалізацыі прынятых органамі Саюза рашэнняў, у тым ліку аб выкананні бюджэту Саюза.

Вышэйшы Савет Саюза вырашае іншыя пытанні, што аднесены гэтым Статутам да паўнамоцтваў Саюза, або перададзены на яго разгляд дзяржавамі-удзельніцамі Саюза ў адпаведнасці з артыкулам 16 гэтага Статута.

Рашэнні Вышэйшага Савета Саюза прымаюцца на аснове аднагалоснасці па прынцыпу "адна дзяржава — адзін голас". Галасаванне на пасяджэннях Вышэйшага Савета Саюза ад імя дзяржаў-удзельніц Саюза ажыццяўляюць іх прэзідэнты. Работа Вышэйшага Савета Саюза вядзецца на аснове зацвярджаемых ім Статута і Правілаў працэдуры Вышэйшага Савета Саюза.

Артыкул 21

Старшынёй Вышэйшага Савета Саюза пачаргова з'яўляецца адзін з Прэзідэнтаў дзяржаў-удзельніц Саюза.

Старшыня Вышэйшага Савета Саюза:

арганізоўвае работу Вышэйшага Савета Саюза;

старшынствуе на яго пасяджэннях;

па даручэнню Вышэйшага Савета Саюза вядзе міжнародныя перагаворы, заключае ад імя Саюза і са згоды Вышэйшага Савета Саюза і ў межах дадзеных Вышэйшым Саветам Саюза паўнамоцтваў міжнародныя дагаворы, прадстаўляе Саюз у адносінах з замежнымі дзяржавамі і міжнароднымі арганізацыямі.

Рашэнні, прынятыя Вышэйшым Саветам Саюза, падпісваюцца Прэзідэнтамі дзяржаў-удзельніц Саюза.

Глава VII
Парламенцкі Сход Саюза

Артыкул 22

Парламенцкі Сход Саюза з'яўляецца прадстаўнічым органам Саюза.

Парламенцкі Сход Саюза складаецца з дэпутацый, якія дэлегуюцца адпаведна **Нацыянальным Сходам Рэспублікі Беларусь** і Федэральным Сходам Расійскай Федэрацыі. Кожная парламенцкая дэпутацыя ўключае роўную колькасць прадстаўнікоў: па 36 ад дзяржавы-удзельніцы Саюза.

Дэлегаванне прадстаўнікоў у склад Парламенцкага Сходу Саюза, а таксама іх адкліканне ажыццяўляюцца **парламентамі дзяржаў** — удзельніц Саюза ў адпаведнасці з іх рэгламентамі. Тэрмін дзеяння і парадак спынення паўнамоцтваў дэпутацый вызначаецца адпаведным **парламентам** самастойна.

Артыкул 23

Парламенцкі Сход Саюза:

а) вырашае пытанні развіцця нарматыўнай прававой базы інтэграцыі дзяржаў-удзельніц Саюза ў палітычнай, прававой, эканамічнай, сацыяльнай, гуманітарнай і іншых галінах;

б) прымае нарматыўныя прававыя акты, маючыя статус заканадаўчай рэкамендацыі Саюза, якія падлягаюць першачарговаму разгляду і прыняццю ва ўстаноўленым парадку парламентамі дзяржаў-удзельніц Саюза ў мэтах уніфікацыі іх заканадаўства;

в) уносіць прапановы па пытаннях развіцця нарматыўнай прававой базы Саюза ў Вышэйшы Савет Саюза і ў органы дзяржаў-удзельніц Саюза, якія валодаюць правам заканадаўчай ініцыятывы;

г) садзейнічае уніфікацыі заканадаўства дзяржаў-удзельніц Саюза;

д) забяспечвае ўзаемадзеянне парламентаў дзяржаў-удзельніц Саюза па пытаннях, якія маюць узаемны інтарэс;

е) заслухоўвае інфармацыю аб дзейнасці Выканаўчага Камітэта Саюза;

ж) разглядае **праект бюджэту Саюза;**

з) ажыццяўляе кантрольныя функцыі ў межах, устаноўленых гэтым Статутам;

і) заслухоўвае пасланні Вышэйшага Савета Саюза аб асноўных напрамках развіцця Саюза;

к) разглядае міжнародныя дагаворы, заключаныя ад імя Саюза;

л) садзейнічае абмену прававой інфармацыяй, удзельнічае ў стварэнні адзінай інфармацыйна-прававой сістэмы Саюза;

м) заключае пагадненні аб супрацоўніцтве з парламентамі замежных дзяржаў і міжнароднымі парламенцкімі арганізацыямі;

н) ажыццяўляе іншыя паўнамоцтвы ў адпаведнасці з гэтым Статутам.

Артыкул 24

Чарговыя пасяджэнні Парламенцкага Сходу Саюза праводзяцца два разы ў год.

Пасяджэнні Парламенцкага Сходу Саюза правамоцныя, калі на іх прысутнічае не менш чым дзве трэці ад агульнага складу кожнай дэпутацыі.

Работа Парламенцкага Сходу Саюза вядзецца на аснове яго Рэгламенту.

Парламенцкі Сход Саюза ўтварае з ліку сваіх членаў пастаянныя і часовыя камісіі, якія ўзаемадзейнічаюць з адпаведнымі камітэтамі і камісіямі палат парламентаў дзяржаў-удзельніц Саюза па пытаннях свайго ведання.

Старшыня Парламенцкага Сходу Саюза і яго першы намеснік выбіраюцца на ратацыйнай аснове Парламенцкім Сходам Саюза са свайго складу тэрмінам на адзін год.

Старшыня Парламенцкага Сходу Саюза і яго першы намеснік не могуць быць грамадзянамі адной дзяржавы-удзельніцы Саюза.

Старшыня Парламенцкага Сходу Саюза, яго намеснікі і кіраўнікі пастаянных камісій утвараюць Савет Парламенцкага Сходу Саюза.

Забеспячэнне дзейнасці Парламенцкага Сходу Саюза ажыццяўляецца адпаведным апаратам.

Артыкул 25

Правам унясення праектаў прававых актаў у Парламенцкі Сход Саюза валодаюць: органы Саюза, кіраўнікі дзяржаў, парламенты, урады дзяржаў-удзельніц Саюза, дэпутацыі Беларусі і Расіі, а таксама групы дэпутатаў колькасцю не менш чым адна пятая ад агульнай колькасці дэпутатаў Парламенцкага Сходу Саюза.

Рашэнне Парламенцкага Сходу Саюза лічыцца прынятым, калі за яго прагаласавала большасць ад агульнага складу кожнай дэпутацыі.

Артыкул 26

Дзяржавы-удзельніцы Саюза ствараюць умовы для пераўтварэння Парламенцкага Сходу Саюза ў прадстаўнічы і заканадаўчы орган Саюза, які выбіраецца непасрэдна грамадзянамі Саюза.

Глава VIII
Выканаўчы Камітэт Саюза

Артыкул 27

Выканаўчы Камітэт Саюза з'яўляецца пастаянна дзеючым выканаўчым органам Саюза.

Старшыня Выканаўчага Камітэта Саюза і яго намеснікі назначаюцца на пасаду і вызваляюцца ад пасады Вышэйшым Саветам Саюза.

Выканаўчы Камітэт Саюза фарміруецца Вышэйшым Саветам Саюза. У склад Выканаўчага Камітэта ўваходзіць роўная колькасць прадстаўнікоў дзяржаў-удзельніц. Персанальны склад прадстаўнікоў дзяржаў-удзельніц у Выканаўчым Камітэце зацвярджаецца кіраўніком адпаведнай дзяржавы.

Артыкул 28

Функцыі і паўнамоцтвы Выканаўчага Камітэта Саюза, а таксама парадак яго дзейнасці вызначаюцца палажэннем аб ім, якое зацвярджаецца Вышэйшым Саветам Саюза па прапанове Выканаўчага Камітэта Саюза.

Рашэнні Выканаўчага Камітэта прымаюцца на аснове аднагалоснасці па прынцыпу "адна дзяржава — адзін голас".

Выканаўчы Камітэт Саюза штогод прадстаўляе справаздачу Вышэйшаму Савету Саюза і інфармацыю Парламенцкаму Сходу Саюза аб ходзе выканання праектаў і праграм Саюза.

Рашэнне Выканаўчага Камітэта Саюза можа быць прыпынена ці адменена Вышэйшым Саветам Саюза.

Выканаўчы Камітэт Саюза мае апарат, колькасць якога ўстанаўліваецца Вышэйшым Саветам Саюза. Кіраўніком апарату з'яўляецца кіраўнік спраў Выканаўчага Камітэта Саюза, які прызначаецца на пасаду і вызваляецца ад пасады Вышэйшым Саветам Саюза.

Артыкул 29

Для выканання функцый, прадугледжаных гэтым Статутам, рашэннямі Вышэйшага Савета Саюза на падставе прапаноў Выканаўчага Камітэта Саюза могуць засноўвацца на парытэтнай аснове органы Саюза галіновага і іншага характару, а таксама арганізацыі. Кожны з гэтых органаў /арганізацый/ дзейнічае на падставе адпаведнага палажэння аб ім, якое зацвярджаецца Вышэйшым Саветам Саюза або, па яго даручэнню, Выканаўчым Камітэтам Саюза.

Глава IX
Бюджэт і фінансы

Артыкул 30

Бюджэт Саюза фарміруецца ў мэтах фінансавання сумесных праграм, праектаў і мерапрыемстваў, а таксама ўтрымання органаў Саюза.

Выканаўчы Камітэт Саюза распрацоўвае і прадстаўляе праект бюджэту Саюза на разгляд Парламенцкаму Сходу Саюза і на зацвярджэнне Вышэйшаму Савету Саюза.

Бюджэт Саюза фарміруецца за кошт:

а) адлічэнняў, прадугледжаных бюджэтамі дзяржаў-удзельніц Саюза, па нарматывах і ў сумах, якія зацвярджаюцца парламентамі дзяржаў-удзельніц Саюза;

б) паступленняў ад выкарыстання маёмасці Саюза;

в) іншых паступленняў.

Утрыманне органаў Саюза ажыццяўляецца за кошт сродкаў бюджэту Саюза, калі іншае не ўстаноўлена рашэннямі Вышэйшага Савета Саюза.

Пытанні фінансава-гаспадарчай дзейнасці органаў Саюза рэгулююцца Выканаўчым Камітэтам Саюза ў адпаведнасці з нарматыўнымі прававымі актамі Саюза.

Дзяржавы-удзельніцы Саюза самастойна нясуць выдаткі, звязаныя з ажыццяўленнем мерапрыемстваў, не прадугледжаных бюджэтам Саюза.

Артыкул 31

Дзяржавы-удзельніцы Саюза ствараюць неабходныя ўмовы для забеспячэння ўзаемнай канверсоўнасці сваіх валют па бягучых аперацыях.

Рашэнне аб фарміраванні адзінага эмісійнага цэнтра будзе прынята дзяржавамі-удзельніцамі Саюза ў працэсе уніфікацыі іх грашовых сістэм.

Артыкул 32

Дзяржавы-удзельніцы Саюза могуць перадаваць у карыстанне органам Саюза маёмасць, неабходную для ажыццяўлення ўскладзеных на іх паўнамоцтваў. Гэтая маёмасць выкарыстоўваецца выключна для ажыццяўлення задач Саюза, прадугледжаных дадзеным Статутам.

Глава X
Службовыя асобы органаў Саюза і іх апаратаў

Артыкул 33

Службовымі асобамі органаў Саюза і іх апаратаў прызначаюцца грамадзяне дзяржаў-удзельніц Саюза.

Службовыя асобы органаў Саюза і іх апаратаў:

не могуць сумяшчаць работу ў апаратах органаў Саюза з іншай аплатнай дзейнасцю, за выключэннем педагагічнай, навуковай ці іншай творчай дзейнасці;

не маюць права займацца дзейнасцю, несумяшчальнай з іх статусам службовых асоб апаратаў органаў Саюза, і выкарыстоўваць свае службовае становішча, у прыватнасці, у інтарэсах палітычных партый і аб'яднанняў.

Прававы статус службовых асоб органаў Саюза і іх апаратаў рэгулюецца асобным пагадненнем.

Службовыя асобы органаў Саюза і іх апаратаў пры выкананні сваіх службовых абавязкаў карыстаюцца сацыяльна-бытавым, медыцынскім і транспартным абслугоўваннем, а таксама сродкамі сувязі ў парадку і на ўмовах, устаноўленых заканадаўствам дзяржавы знаходжання для адпаведных груп дзяржаўных пасад.

Пенсіённае забеспячэнне службовых асоб органаў Саюза і іх апаратаў ажыццяўляецца ў парадку і на ўмовах, што вызначаюцца заканадаўствам дзяржаў-удзельніц Саюза, грамадзянамі якіх яны з'яўляюцца, для дзяржаўных служачых.

Глава XI
Урэгуляванне рознагалоссяў

Артыкул 34

Пры ўзнікненні рознагалоссяў па прымяненню ці тлумачэнню Дагавора аб Саюзе Беларусі і Расіі ад 2 красавіка 1997 года і гэтага Статута дзяржавы-удзельніцы Саюза вырашаюць іх шляхам узаемных кансультацый і перагавораў.

Дзяржавы-удзельніцы Саюза прадухіляюць магчымыя рознагалоссі праз адпаведныя органы Саюза.

Вышэйшы Савет Саюза правамоцны ажыццяўляць належныя пагаджальныя працэдуры для ўрэгулявання рознагалоссяў.

У выпадку прыняцця дзяржавай-удзельніцай Саюза нарматыўнага прававога акта, які супярэчыць гэтаму Статуту ці прынятым у адпаведнасці з ім нарматыўным прававым актам Саюза, Вышэйшы Савет Саюза і, у межах сваіх паўнамоцтваў, Выканаўчы Камітэт Саюза, звяртаюць увагу органаў гэтай дзяржавы на такое парушэнне з мэтай яго ўстаранення.

Дзяржавы-удзельніцы Саюза засноўваюць Суд Саюза.

Глава XII
Выхад з Саюза

Артыкул 35

Дзяржава-удзельніца Саюза мае права выйсці з Саюза. Аб намеры спынення свайго ўдзелу ў Саюзе яна пісьмова паведамляе Вышэйшаму Савету Саюза і другой дзяржаве-удзельніцы за 12 месяцаў да выхаду.

Выхад аднаго з удзельнікаў Саюза не ўплывае на выкананне ім абавязацельстваў, якія ўзніклі ў перыяд удзелу ў Саюзе і рэалізацыя якіх абумоўлена пэўным перыядам часу.

Глава XIII
Заключныя палажэнні

Артыкул 36

Папраўкі да гэтага Статута могуць быць прапанаваны дзяржавай-удзельніцай Саюза, Вышэйшым Саветам Саюза і Парламенцкім Сходам Саюза. Праекты рашэнняў па прыняццю паправак разглядаюцца Вышэйшым Саветам Саюза.

Папраўкі падлягаюць ратыфікацыі дзяржавамі-удзельніцамі Саюза і ўступаюць у сілу з дня абмену ратыфікацыйнымі граматамі.

Артыкул 37

Для вырашэння прынцыповых пытанняў, звязаных з далейшым развіццем Саюза, могуць праводзіцца рэферэндумы ў адпаведнасці з заканадаўствам дзяржаў-удзельніц Саюза.

Артыкул 38

Афіцыйнымі мовамі Саюза з'яўляюцца беларуская і руская мовы.

У якасці рабочай мовы органаў Саюза выкарыстоўваецца руская мова.

Артыкул 39

Вышэйшы Савет і Парламенцкі Сход, створаныя ў адпаведнасці з артыкуламі 9 і 10 Дагавора аб стварэнні Супольніцтва Беларусі і Расіі ад 2 красавіка 1996 года, пераўтвараюцца адпаведна ў Вышэйшы Савет Саюза і Парламенцкі Сход Саюза ў парадку, узгодненым прэзідэнтамі дзяржаў-удзельніц Саюза.

Выканаўчы Камітэт, створаны ў адпаведнасці з артыкулам 11 Дагавора аб стварэнні Супольніцтва Беларусі і Расіі ад 2 красавіка 1996 года, а таксама іншыя органы Супольніцтва Беларусі і Расіі выконваюць свае функцыі да прыняцця Вышэйшым Саветам Саюза рашэння аб пераўтварэнні іх у адпаведныя органы Саюза.

Артыкул 40

Гэты Статут падлягае ратыфікацыі разам з Дагаворам аб Саюзе Беларусі і Расіі ад 2 красавіка 1997 года і ўступае ў сілу з дня абмену ратыфікацыйнымі граматамі.

Здзейснена ў г. Маскве 23 мая 1997 года ў двух экземплярах, кожны на беларускай і рускай мовах, прычым абодва тэксты маюць аднолькавую сілу.

За Расійскую Федэрацыю
Б.Ельцын

За Рэспубліку Беларусь
А.Лукашэнка

Слово ученому

М.СУМОНОВ,
кандидат экономических наук

Что может личное подсобное хозяйство,
или О том, как один мужик двух генералов кормит

Прошло шесть лет после начала реформ, если считать точкой отсчета 1991 год, когда в республике стало зарождаться фермерство, наделяться личное подсобное хозяйство участками до одного гектара земли, а также осуществляться реструктуризация общественного производства. Каковы реальные подвижки в этом деле, есть ли успехи, какова эффективность различных форм хозяйствования?

Я сделал попытку с учетом имеющейся информации ответить на эти вопросы. За шесть лет создано три тысячи фермерских хозяйств при среднем размере почти 18 гектаров сельскохозяйственных угодий, что соответствует средней величине хозяйства Евросоюза. Реформировано 74 колхоза и совхоза в новые организационные структуры (акционерные общества, кооперативы и т.д.). Для расширения личных подсобных хозяйств, садоводства и огородничества выделено свыше 900 тысяч гектаров земли. В настоящее время функционирует свыше 1,5 миллиона личных подсобных хозяйств, которые в среднем располагают 0,75 гектара земли на двор. В результате проведенных мер по новым формам собственности и хозяйствования в 1996 году произведено около 14,5 процента валовой продукции.

Вместе с тем за анализируемый период допущен большой спад производства. Большинство колхозов и совхозов находятся в глубоком кризисном состоянии, многие на грани банкротства. Так, в 1996 году по сравнению с 1990 годом производство валовой продукции в сопоставимых (1983 г.) ценах в общественном секторе снизилось на 46 процентов при среднегодовом темпе спада 11 процентов. Особенно большой спад допустили колхозы и совхозы в производстве продукции животноводства, картофеля и овощей. Так, производство мяса за шесть лет снизилось на 54 процента, молока — на 49, картофеля — на 56, овощей — на 54 процента. При этом производство молока на 34 процента уменьшилось за счет спада продуктивности коров и на 66 процентов — за счет уменьшения их численности. По производству мяса влияние этих факторов сказалось соответственно на 27 и 73 процента.

В личном подсобном хозяйстве, включая фермерское, за анализируемый период производство валовой продукции увеличилось на 40 процентов при среднегодовом темпе роста 9,7 процента. Сбор зерна возрос в шесть раз, картофеля — в два, овощей — в четыре раза. Что касается развития животноводства, то тут результаты скромнее. Производство молока увеличилось на 14 процентов, и все за счет роста продуктивности коров; мяса в убойном весе — на 3 процента.

Поскольку в настоящее время показатели работы реформированных хозяйств общественного сектора органами Минстатистики и анализа пока не обобщаются, то я сделал сопоставление эффективности работы колхозов и совхозов в целом, личных подсобных и фермерских хозяйств. Показатели представлены в таблице 1.

Таблица 1

Показатели эффективности работы сельскохозяйственных предприятий в зависимости от форм собственности и хозяйствования

Показатели	Ед. изм.	годы: 1990	годы: 1991—1995 в среднем	годы: в т.ч. 1995	годы: 1996, предв. данные	1996 г., в % к 1990 г.	1996 г., в % к 1995 г.
Валовая продукция в сопоставимых (1983 г.) ценах на 100 га с.-х. угодий:	тыс руб.						
в общественном хозяйстве	-"-	103	82	63	62	60	98
в личных подсобных хозяйствах (ЛПХ), включая фермерские	-"-	483	299	253	258	55	106
Произведено на 100 га с.-х. угодий молока:	ц						
в общественном хозяйстве	-"-	647	492	395	378	58	95
в ЛПХ	-"-	3012	1408	1363	1397	44	102
в фермерских хозяйствах	-"-	-	152	152	155	-	102
мяса в убойном весе:							
в общественном хозяйстве	-"-	116	87	63	58	50	92
в ЛПХ	-"-	293	118	115	117	40	102
в фермерских хозяйствах	-"-	-	42	42	46	-	110
Урожайность зерновых:	ц/га						
в общественном хозяйстве	-"-	26,6	24,3	20,5	21,6	81	105
в ЛПХ	-"-	27,4	25,3	20,5	22,4	82	109
в фермерских хозяйствах	-"-	25,6	20,4	18,3	20,3	79	111
Урожайность картофеля:	ц/га						
в общественном хозяйстве	-"-	137	115	110	144	108	135
в ЛПХ	-"-	132	137	135	151	114	112
в фермерских хозяйствах	-"-	121	121	119	139	115	116
Удой на корову:	кг						
в общественном хозяйстве	-"-	3220	2504	2150	2136	66	99
в ЛПХ, включая фермерские	-"-	2639	2706	2766	2785	106	101

Из таблицы видно, что производство валовой продукции в сопоставимых ценах в расчете на 100 гектаров сельхозугодий в личных подсобных хозяйствах было выше, чем в общественном секторе, в 1990 году в 4,8 раза. Сохранилась эта тенденция и в 1996 году (в 4,5 раза). По производству молока на единицу земли личные подсобные хозяйства в 1990 году превосходили общественный сектор в 4,7 раза, а в 1996 году — в 3,7 раза. По производству мяса — соответственно в 2,4 и 2,0 раза.

Что же касается показателей продуктивности растениеводства, то здесь различия менее существенные. Урожайность зерновых в среднем за шесть лет была лишь на 4,1 процента выше, чем в колхозах и совхозах, картофеля — на 13,1 процента.

Показатели работы фермерских хозяйств в среднем пока уступают как колхозам и совхозам, так и личным подсобным хозяйствам, но имеют тенденцию к росту. Это связано с тем, что фермерам, как правило, выделены худшие или средние по плодородию земли. Они пока не вовлечены в вертикальную кооперацию и предоставлены сами себе. Не пользуются в такой степени финансовой государственной поддержкой, как общественные хозяйства. Очевидно также, что из-за криминальной безопасности фермеры занижают свои показатели работы.

Основное соперничество идет между коллективными и личными подсобными хозяйствами на протяжении многих десятков лет. Личные подсобные хозяйства, рожденные в стране в период коллективизации сельского хозяйства, имеют свои взлеты и падения. Ни в одной развитой стране мира нет такого раздвоения труда, как это было в СССР, — чтобы крестьянин работал в двух хозяйствах: личном подсобном и коллективном. То есть в первом случае он являлся собственником результатов своего труда, во втором случае выступал как бы наемным работником и работал на государство. Иными словами, как в сказке Салтыкова-Щедрина — двух генералов кормит.

Как в довоенный, так и в послевоенный периоды личные подсобные хозяйства являлись основными производителями продовольствия в республике. Лишь в 1960 году колхозы и совхозы по производству валовой продукции вышли вперед, а по животноводческой продукции — в 1965 году. Попытки бороться с личными подсобными хозяйствами административными методами, как это имело место при Н.С.Хрущеве, а затем при Л.И.Брежневе, приводили к обострению продовольственной ситуации в стране.

Некоторые ученые и специалисты считают, что личные подсобные хозяйства живут за счет кормовой базы колхозов и совхозов и другой помощи с их стороны. Так ли это? Не лукавили ли опять из политических амбиций? Данные Минстата и анализа, а также отчетов колхозов и совхозов позволяют прояснить этот "закоренелый" вопрос. Кормовые ресурсы, которые выделяли колхозы и совхозы (а это на 87 процентов сено и зеленая масса пастбищ), занимали в среднем в 1990—1995 гг. 22 процента в общем объеме кормового баланса личных подсобных хозяйств. Основную же часть кормов (78 процентов) личные подсобные хозяйства получают на своих приусадебных участках либо частично приобретают на стороне. В 1990—1995 годах они произвели в среднем валовой продукции животноводства в сопоставимых ценах более чем на 28 процентов, тогда как их удельный вес в общем объеме используемых кормов в республике составил лишь 23 процента. Это свидетельствует о более рациональном использовании кормов и более высокой продуктивности и сохранности поголовья животных. В личных подсобных хозяйствах на условную голову скота выход валовой продукции животноводства был больше, чем в общественном хозяйстве: в 1981—1985 годах — в среднем на 52 процента, 1986—1990 годах — на 19, 1991—1995 годах — на 38 процентов. Если в колхозах и совхозах в 1991—1995 годах пало почти 30 процентов от поголовья свиней и 3,5 процента крупного рогатого скота, то в личных подсобных хозяйствах такого явления нет. Что же касается мнения о том, что крестьяне еще воруют корма из общественного хозяйства, то не в этом ли есть суть противоречий системы хозяйствования и производственных отношений на селе?

Более высокая эффективность, конкурентоспособность и устойчивость производства в личных подсобных хозяйствах, несмотря на применение конно-ручных технологий и отсутствие вертикальной интеграции, основана на частнособственническом производстве, побуждающем более высокую мотивацию труда.

(Окончание на 2-й стр.)

Что может личное подсобное хозяйство,

или О том, как один мужик двух генералов кормит

(Окончание. Начало на 1-й стр.)

Была ли возможность в Беларуси пойти по цивилизованному европейскому пути развития сельского хозяйства? Была.

В аграрной экономической науке 20-х годов выделялись тогда три направления по развитию сельского хозяйства.

Либерально-демократическое направление отстаивало частную собственность на землю, считало общину отжившей формой организации производства и труда, поддерживало крестьянскую кооперацию.

Организационно-производственная школа полагала, что трудовое семейное хозяйство, в сочетании с различными видами кооперации, преимущественно вертикальной, является наиболее эффективным путем развития сельского хозяйства. Представители этой школы (Чаянов А.В. и др.) поддерживали теорию устойчивости мелкого крестьянского хозяйства к меняющимся условиям производства.

Марксистская школа отвергала частную собственность на землю и все надежды возлагала на коллективные формы хозяйствования.

Судьба представителей первой и второй ветвей аграрной экономической науки оказалась трагической. Если либеральные демократы были высланы из страны в начале двадцатых годов, то представители организационно-производственной школы были репрессированы в начале тридцатых годов. В жесткой борьбе победило марксистское направление.

А.В.Чаянов очень сдержанно относился к коллективизации ("полной сельскохозяйственной кооперации"). По его мнению, с коллективизацией исчезает крестьянин как хозяин. Он становится просто работником, так как в крупном предприятии очень трудно налаживается организация труда, его мотивация. В своей книге "Основные идеи и формы сельскохозяйственной кооперации" А.В.Чаянов отмечает, что "для того, чтобы избежать равнения всех работников по наихудшему, требуется либо рабочий энтузиазм всего коллектива, либо такая система организации труда и его стимуляции, которые обеспечили бы нужную направленность рабочего каждого из участников коллектива". Поэтому для сплочения коллектива необходимо соблюдать ряд условий, из которых наиболее важными являются:

— достаточная материальная заинтересованность с получением дохода не ниже того, что получал крестьянин раньше;

— привычка к землевладельческому труду;

— примерно одинаковый уровень общественного развития работников;

— достаточная общественная (экономическая) и техническая приспособленность к коллективному хозяйствованию.

К сожалению, ни одно из этих требований не было полностью учтено при коллективизации сельского хозяйства, не выполняются они и в настоящее время.

Европейская цивилизация не приняла марксистскую школу. Интенсивное сельское хозяйство здесь предпочли развивать на основе частного семейного предпринимательства с развитием вертикальной кооперации. В настоящее время, например, средний размер фермерского хозяйства стран Евросоюза составляет 18 гектаров сельскохозяйственных угодий, где обеспечивается высокоинтенсивное производство. Урожайность зерновых в 1986—1995 годах в среднем составила почти 50 центнеров с гектара, а в отдельных странах — около 80 центнеров с гектара. При среднем размере фермы на 20 коров надаивают около 5000 килограммов молока от коровы. На свинофермах содержится в среднем около 80 свиней, на фермах по откорму крупного рогатого скота — 20 голов. Выращивание мяса в убойном весе на условную голову скота в 2,6 раза выше, чем у нас в республике на фермах, которые по численности поголовья превосходят в сотни раз.

В Евросоюзе 59 процентов угодий принадлежат фермерам на основе частной собственности, остальная часть (41%) арендуется. Хочу разочаровать тех, кто полагает, будто в Голландии земля принадлежит государству. Нет. Здесь 65 процентов угодий используются фермерами в порядке частной собственности и лишь 31 процент арендуется.

Что сегодня отличает развитый мир от наших систем сельского хозяйства, когда некомплектно спокойно, без создания "штабов" и без суеты и организации "битв за урожай" накормить свой народ? Отличие заключается в приоритетах в развитии частной собственности. Профессионализм труда как неотъемлемая часть конкурентоспособного производства у нас не культивировался. Производство любили, как говорят, средствами — вот девиз административно-командного системы. От крестьянина требовалось отработать необходимое количество человеко-дней в году. Профессионализм в сознании крестьян может быть достигнут, если это станет культом государственной политики, если это станет национальной гордостью, если потеря профессионального мастерства и умения хорошо трудиться будет осуждаться как потеря человеческого достоинства, позорение. Достичь этого можно на основе частной собственности, порождающей как мастерство, так и экономический успех, сохранение ресурсов. Эта благотворная сила обеспечивает ответственность человека перед обществом, благополучие всего общества настолько, насколько широко раскрыт простор для творческих устремлений для каждого человека. Например, средний срок службы зернового комбайна в США в 2,9 раза больше, чем у нас, во Франции — в 2,3 раза.

Выход из кризиса может быть успешным, если бюрократии удастся освободиться от мифов, одним из которых является необходимость сохранения крупного производства, как наиболее эффективного. Бывший СССР имел самые крупные по угодьям хозяйства и фермы по численности поголовья скота, которые в сотни, тысячи раз превосходили показатели стран Евросоюза. Еще многие столетия вряд ли зарубежные страны достигнут подобных показателей. СССР располагал самым большим количеством сельхозугодий в мире и на душу населения занимал третье место в мире — после Австралии и Канады. И в то же время являлся главным импортером продовольствия в мире. Невероятно? Это все плоды гигантомании и отсутствия частной собственности.

Второй миф, что у нас невозможно создать фермерство по типу западноевропейского, что у нашего крестьянина еще жив общинный тип хозяйствования. Даже не принимается в расчет опыт работы личных подсобных хозяйств, где свыше 1,5 миллиона крестьян на землях до одного гектара обеспечивают гораздо более интенсивное производство без государственных капвложений, на конно-ручных технологиях, без уполномоченных, "штабов" и "битв за урожай". Почему среди этих крестьян мы не можем найти тех, кто с достоинством поспорил бы с фермерами США, Нидерландов, Германии? Еще А.Н.Энгельгард в своих "Письмах из деревни" указывал, что эффективное производство может быть достигнуто, если интеллигент "сядет" на землю. Почему же наш белорусский интеллигент не идет в фермеры? Боится остаться один на один с бюрократией. Нет гарантий со стороны государства в устойчивом материально-техническом, сбытовом и финансовом сервисном обеспечении. Органам управления нужно менять стиль работы, а это очень трудно. Бюрократия не научилась уважать крестьянина, не разучилась грозить ему и внушать страх. Она не умеет учитывать интересы крестьянина, а следовательно, не умеет служить ему, соблюдая при этом государственные интересы. Да, на расхлябанности колхозно-совхозной системы в рынок не въедешь. Но кто порождает ее, какова ее природа? Почему с ней можно бороться только "сверху" и только командно-административными методами, прибегая к помощи президентской вертикали? Думается, что за шесть лет в сознании органов управления произошли незначительные подвижки в необходимости радикальных реформ, желании и умении их проводить.

Белорусским НИИ экономики и информации АПК еще в 1991 году разработана программа перехода АПК БССР на рыночные отношения. В 1996 году была разработана и утверждена правительством новая государственная программа реформирования АПК Республики Беларусь. Дано свыше 50 разработок, охватывающих различные стороны построения рыночного механизма в агропромышленном комплексе. Однако реализуются они пока крайне медленно. Нужны генеральные конструкторы — лидеры проведения реформ в АПК как на уровне республики, так и областей, районов.

Можно ли 1,5 миллиона личных подсобных хозяйств превратить в фермерские хозяйства на основе материально-технической базы колхозов и совхозов, как это было сделано в Польше в 1956 году, где крестьянское хозяйство составляет в среднем 6,7 гектара и ведется гораздо интенсивнее наших колхозов и совхозов? Можно. Но для этого требуется очень большая рутинная работа органов управления, коренного изменения их функций. Пока, к сожалению, бюрократия на это пойти не может, хотя это самый дешевый вариант реформации. Предпочтителен и такой вариант, когда сохраняются 500—600 колхозов и совхозов как конкурентоспособные, готовые и далее работать с применением командно-административной системы управления. Такие хозяйства могут производить примерно 15 процентов валовой продукции. Желательно, чтобы основную часть продукции (60 процентов) производило фермерство, а оставшуюся часть (25 процентов) — товарищества, кооперативы собственников, сформированные по экономическим интересам. Проведенными исследованиями ученых еще в 20—30-е годы было установлено, что групповые экономические интересы могут быть общими в коллективах максимум до 50 человек. В последних двух типах хозяйств отпадет необходимость в личных подсобных хозяйствах.

Утверждение некоторых специалистов о том, что проведение реформ — дело не одного года и даже десяти лет, свидетельствует о неуверенности органов управления в своих силах и неспособности на преобразования. Уже шесть лет как сельское хозяйство республики лежит на операционном столе реформационной палаты. Не умереть бы.

Таблица 2

Динамика структуры валовой продукции в сопоставимых (1983 г.) ценах по категориям хозяйств, в процентах

Хозяйства	Годы											
	1950	1953	1955	1960	1965	1970	1975	1980	1985	1990	1995	1996
Всего	100	100	100	100	100	100	100	100	100	100	100	100
Колхозы, совхозы и межхозы	38	36	47	51	56	59	63	66	70	75	56	54
ЛПХ, включая фермерские и садово-огородные хозяйства	62	64	53	49	44	41	37	34	30	25	44	46

Стоп-кадр



Редко случается, что любимым предметом у девчонок бывает математика. А вот для девятиклассницы Солигорской СШ № 6 Наташи Куриш (на снимке) решение алгебраических и геометрических задач — любимое занятие. Ее успехами в математике и победами на многочисленных олимпиадах гордятся в классе все ее друзья и, конечно, учитель Валентина Федоровна Минюкевич, которая, разглядев в девочке незаурядные способности, сумела привить Наташе интерес к точным наукам.

Фото Владимира АМЕЛЬЧЕНИ, БелТА.

Загадка

Такі прыгожы дом, але не хочуць у ім сяліцца. Чаму?

Маецца на ўвазе жылы дом па вуліцы Лодачнай у Мінску. Бадай, самы прыгожы ў сталіцы і размешчаны ў самым цэнтры, на беразе ракі. Здавалася б, жыць тут — адна мара. Але большасць вокнаў — цёмныя па вечарах.

Кватэры гэтага прыгажуна выстаўляліся на аўкцыён. І не знайшлі гаспадароў. Днямі іх паўторна прапаноўвалі на чарговым аўкцыёне. Але шыкоўныя кватэры "не займелі" гаспадароў.

Былі куплены сталовая і дзве пральні.

Чаму не купляюць такія прэстыжныя кватэры? Спецыялісты гарадскога камітэта па кіраванню дзяржаўнай маёмасцю і прыватызацыі лічаць, што пакупнікоў адпуджвае цана. (Так трохпакаёвая кватэра агульнай плошчай 107 квадратных метраў каштуе 2 мільярды 520 мільёнаў рублёў.) Магчыма. Але не верыцца, каб у нас не было людзей з такімі грашыма. Напэўна, проста не жадаюць "засвяціцца", чуючы з самага верху пагрозлівыя прамовы наконт прыватызацыі і прыватызатараў. Калі ж людзей з такімі капіталамі няма, дык навошта будаваць на продаж такое жыллё?

Не, ёсць тут нейкая інтрыга.

Яўген ТАЎГЕНЬ.

Рука кітайскага Джыліна

Джылін — так называецца падсавет Кітайскага савета садзейнічання міжнароднаму гандлю. Ён працягнуў руку Беларускаму саюзу прадпрымальнікаў. Пагадненне паміж імі, якое падпісана днямі, прадугледжвае абмен інфармацыяй, візітамі спецыялістаў, сумеснае наладжванне ярмарак і выстаў, дапамогу ў падборы бізнес-партнёраў.

Ігар ПЯТРОЎ.

Ситуация

Царек автобусного масштаба,

или Кто скрывается под номером 20854?

То, что в салоне автобуса появился контролер, не ощущалось. Не было обычной суеты, никто не вытаскивал из кармана дежурный талончик и не пытался незаметно, второпях его прокомпостировать. Все пассажиры послушно предъявляли свои проездные документы. Гроза всех "зайцев", которые пока не обнаруживались, вяло продвигался вперед. "Понедельник — тяжелый день для всех", — подумалось мне. Контролер приостановился рядом. Мужчина, дышавший перегаром, извиняясь, прошептал: "Пожалей, милый, талончик не успел купить". "Платите штраф", — изрек неизменную в таких ситуациях фразу контролер. "Заплатил бы, да нечем, — вымолвил пассажир. — Я сейчас выйду". И он продвинулся к выходу.

